**355.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Сядзіба, у якой рус..кі мастак Іл..я Рэпін жыў у канцы дзевятнаццатага — пачатку дваццатага стагод..я, знаходзіцца за шаснаццаць кіламетраў на поўнач ад Віцебска[м]. Мастак набыў яе ў тыс..ча васемсот дзевяноста другім годзе, пасля таго як прадаў адну са сваіх карцін рус..каму імператару Ал..ксандру Трэцяму.

У Здраўнёве жыў не толькі сам Рэпін, але і яго дзеці, унукі. З двухтыс..чнага года тут можна пабачыць рэпінскія акварэлі, малюнкі, два абразы, напісаныя для ц..рквы, а таксама ф..таздымкі, рукапісы, кнігі, лісты *(Паводле Н. Гальпяровіча, Н. Ванінай, Т. Сівец)*.

**восемсóт**

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Пазначце літарай *к* лічэбнікі, якія абазначаюць колькасць прадметаў, літарай *п* — лічэбнікі, якія абазначаюць парадак прадметаў пры лічэнні.

Жыццё і творчасць якіх вядомых мастакоў звязаны з Віцебшчынай?

## § 57. Лічэбнікі колькасныя і парадкавыя

**356.** Перанясіце табліцу ў сшытак і запоўніце яе, упісаўшы прыведзеныя ніжэй словазлучэнні.

| Лічэбнікі абазначаюць | | | |
|---|---|---|---|
| **цэлыя лікі** | **частку ад цэлага ліку** | **сукупнасць прадметаў** | **парадак прадметаў** |
| *пяць метраў...* | *тры пятыя шляху...* | *сямёра птушанят...* | *другі тайм...* |

Пятая серыя, шэсць месяцаў, трое коней, дзве трэція атрада, дванаццаць авечак, сямнаццатая старонка, сорак сем спартсменаў, адна восьмая пірага, пяцёра лыжнікаў.

! У залежнасці ад значэння і граматычных прымет лічэбнікі падзяляюцца на колькасныя і парадкавыя.

**Колькасныя** лічэбнікі абазначаюць лік або колькасць прадметаў і адказваюць на пытанне к о л ь к і? Да колькасных лічэбнікаў адносяцца:



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

- лічэбнікі, якія абазначаюць цэлыя лікі: *сем, дваццаць*;
- дробавыя лічэбнікі (абазначаюць частку ад цэлага ліку або цэлы лік і яго частку): *дзве пятыя, адна цэлая і пяць дзясятых*;
- зборныя лічэбнікі (абазначаюць сукупнасць прадметаў): ***двое** кацянят, **шасцёра** салдат*.

**Парадкавыя** лічэбнікі абазначаюць парадак прадметаў пры лічэнні і адказваюць на пытанне я к і? (к а т о р ы?): ***трэці** паверх, **сто адзінаццаты** год*.

**357.** Карыстаючыся схемай, складзіце вуснае паведамленне пра разрады лічэбнікаў паводле значэння і граматычных прымет. У якасці прыкладаў выкарыстайце лічэбнікі з прыведзеных ніжэй сказаў.




1. Шыковіч падняўся на другі паверх, заглянуў у прыёмную рэдактара, у кабінет намесніка *(І. Шамякін)*. 2. Праз хвілін пятнаццаць галоўныя трэнеры запоўнілі[с] судзейскі пратакол *(А. Камароўскі)*. 3. А ехалі мы двое сутак *(У. Дубоўка)*. 4. Вярста — мера даўжыні, роўная адной цэлай і шасці сотым кіламетра *(«Тлумачальны слоўнік»)*.

Знайдзіце ў сказах устарэлае слова.

**358.** Прачытайце тэкст. Чаму вучаць нас подзвігі піянераў-герояў?

У час Вялікай Айчыннай вайны супраць гітлераўскіх акупантаў ваявалі не толькі дарослыя, але і дзеці. Толькі ў акупаванай Беларусі ваявалі не менш за 74 500 дзяцей і падлеткаў. Яны дзейнічалі з першых дзён акупацыі, рызыкуючы жыццём.

Напрыклад, полацкі хлопчык Лёня Касач сабраў на месцах бітваў 45 вінтовак, 2 ручныя кулямёты, некалькі кошыкаў патронаў і гранат і надзейна схаваў усё гэта. Калі надарыўся выпадак, перадаў усё партызанам.

Сярожа Расленка ў 13 гадоў акрамя збірання зброі вёў разведку і перадаваў звесткі партызанам. Шасцікласнік Віця Пашкевіч восенню 1941 года арганізаваў у акупаваным фашыстамі Барысаве спецыяльную каманду, якая выносіла з варожых складоў зброю і боепрыпасы, дапамагала ладзіць падпольшчыкам уцёкі ваеннапалонных з канцлагераў...

Такіх гераічных прыкладаў шмат. Сёння гэтыя подзвігі маленькіх беларусаў вучаць нас рабіць добрыя ўчынкі, не думаючы пра славу і ўзнагароды. Нездарма кажуць, што ўсе вялікія справы пачынаюцца з малога *(Паводле С. Журневіч)*.

Выпішыце з тэксту спачатку колькасныя, а затым парадкавыя лічэбнікі (разам з назоўнікамі, з якімі яны спалучаюцца). Абгрунтуйце свой выбар.

Раскажыце пра вядомых вам піянераў-герояў. Можаце выкарыстаць матэрыялы кнігі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» (V—IX класы).

Лічэбнік разам з назоўнікам утварае **колькасна-іменнае словазлучэнне.**

У колькасна-іменных словазлучэннях з лічэбнікамі *адзін, два (дзве), тры, чатыры* галоўным словам з'яўляецца назоўнік:

*адна сасна, тры вавёркі.*

У колькасна-іменных словазлучэннях з лічэбнікамі *пяць, шэсць* і далей, за выключэннем лічэбнікаў, якія заканчваюцца на *адзін, два (дзве), тры, чатыры*, галоўным словам з'яўляецца лічэбнік:

*восем вершаў, дванаццаць спартсменаў.*

Але ва ўскосных склонах (акрамя вінавальнага) галоўным словам у такіх словазлучэннях выступае назоўнік:

*васьмі вершаў* (Р.), *дванаццацю спартсменамі* (Т.).

У словазлучэнні з парадкавым лічэбнікам галоўным словам з'яўляецца назоўнік:

*дванаццаты паверх.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**359.** Запішыце колькасна-іменныя словазлучэнні, размяркоўваючы іх на дзве групы: 1) словазлучэнні з галоўным словам — назоўнікам; 2) словазлучэнні з галоўным словам — лічэбнікам.

**Чатыры практыкаванні, чацвёртае практыкаванне, адзінаццаты малюнак, адзінаццаць малюнкаў, адзінаццаці малюнкаў, восьмы месяц, восем месяцаў, васьмю месяцамі.**

Якія лічэбнікі адрозніваюцца націскам ад адпаведных лічэбнікаў у рускай мове?

**360.** Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя лічэбнікі *тры* або *трэці* ў патрэбнай склонавай форме. Вызначце разрады лічэбнікаў.

1) да ... пеўняў
2) гнуцца ў ... пагібелі
3) заблудзіцца ў ... соснах

а) ‘не разабрацца ў самым простым, элементарным’
б) ‘празмерна ўгоднічаць, прыніжацца’
в) ‘да самага світання (быць дзе-небудзь, займацца чым-небудзь)’

Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі. З двума фразеалагізмамі (на выбар) складзіце і запішыце сказы.

## § 58. Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі

**361.** Разгледзьце схему. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі паводле будовы?

| | | |
|---|---|---|
| **Лічэбнікі** | **простыя** | *тры, трынаццаць, трыццаць* |
| | **складаныя** | *пяцьдзясят, семдзесят, трыста* |
| | **састаўныя** | *дваццаць тры, сто шэсцьдзясят восем* |

Чым адрозніваецца будова простых, складаных і састаўных лічэбнікаў?

**!** У залежнасці ад будовы лічэбнікі падзяляюцца на простыя, складаныя і састаўныя.

**Простыя** лічэбнікі (ад лічэбніка ***адзін*** да лічэбніка ***дваццаць***, а таксама ***трыццаць, сорак, сто, тысяча, мільён***) маюць адну аснову.